***Качан А.С., Носік А.А.***

**АКТУАЛЬНЫ СТАН КРЫНІЦ ВЫВУЧЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛЕКСІКІ Ў МЕДЫЦЫНСКІХ ВНУ**

*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт*
*Мінск, Беларусь*

**Анатацыя.** Атрыкул прысвечаны апісанню выданняў, якія могуць быць выкарыстаны пры выкладанні беларускай мовы ў медыцынскіх ВНУ. Асноўная ўвага надаецца разгляду структуры дапаможнікаў і найбольш эфектыўных заданняў для засваення тэрміналогіі і развіцця маўлення.

*Ключавыя словы: медыцынская лексіка, анатамічная і клінічная тэрміналогія, тэрмінаэлемент, медыцынскія ВНУ.*

***Kachan A.S., Nosik A.A.***

**CURRENT STATE OF SOURCES FOR STUDYING BELARUSIAN VOCABULA IN MEDICAL INSTITUTIONS**

*Belarusian State Medical University*
*Minsk, Belarus*

**Abstract.** This article is dedicated to the description of publications that can be used in Belarusian language's teaching in the medical higher medical education institutions. The main attention is paid to the structure of the manuals and the most effective exercises for learning terminology and speech.

*Keywords: medical vocabulary, anatomical and clinical terminology, term element, medical institutions.*

Вывучэнне медыцынскай лексікі на беларускай мове не ўяўляецца магчымым без вучэбных дапаможнікаў, якія ў сваім складзе знайшлі рацыянальнае спалучэнне тэарэтычнага матэрыялу і змястоўнай формы. Лексіка займае адно з ключавых месцаў у сістэме прафесійнай падрыхтоўкі будучых урачоў. Аналіз дапаможнікаў на прадмет вывучэння лексікі (тэрміналогіі) патрабуе комплекснага падыходу ў разглядзе як тэарэтычнага, так і і практыка-арыентаванага аспектаў.

Адной з крыніц папаўнення прафесійнага лексічнага запасу студэнтаў-медыкаў з'яўляецца слоўнік анатамічных тэрмінаў, паколькі анатомія служыць фундаментам большасці агульнамедыцынскіх і клінічных дысцыплін [1]. Акрамя таго, тэрміналогія актуальна і пры падрыхтоўцы навуковых і навукова-папулярных артыкулаў для арганізацыі даследчыцкай працы.

Плённай працай выкладчыкаў, якія выкладаюць беларускую мову ў медыцынскіх навучальных установах нашай краіны, падрыхтаваны і выдадзены шматлікія вучэбна-метадычныя дапаможнікі.

Дапаможнік «Беларуская мова: прафесійная лексіка» (аўтары: Т.В. Кітаева, Н.В. Ратынская, БДМУ) складаецца з некалькі частак, кожная з якіх суадносіцца з тэматычным планам вучэбных заняткаў і ўтрымлівае элементы граматыкі, пэўны мінімум тэрміналагічнай лексікі і практыкаванні для

замацавання граматычнага і лексічнага матэрыялу. Асобная роля адводзіцца станаўленню медыцынскай тэрміналогіі і асноўным накірункам у развіцці анатамічнай і клінічнай тэрміналогіі: утварэнню тэрмінаў на аснове беларускай размоўнай лексікі і на аснове грэка-лацінскіх тэрмінаэлементаў праз іх адаптацыю да фанетычных і граматычных нормаў беларускай мовы [2].

Для студэнтаў стаматалагічнага факультэта, якія ў рамках курса агульнагуманітарных дысцыплін вывучаюць прадмет «Беларуская мова: прафесійная лексіка», прызначаны вучэбна-метадычны дапаможнік «Беларуская мова: стаматалагічная тэрміналогія» (аўтары: А.А. Носік, Н.В. Ратынская, Н.У. Чайка, БДМУ) [3]. Дапаможнік складаецца з 6 тэм (модуляў). У кожнай тэме змяшчаюцца тэксты стаматалагічнага профілю на беларускай і рускай мовах, паслятэкставыя заданні і практыкаванні па тэрміналогіі. Асабліва важнымі з’яўляюцца заданні, якія накіраваны на адпрацоўку лексічных навыкаў (складанне дыялогаў, пастаноўка пытанняў да тэксту, утварэнне тэрмінаў) і навыкаў практычнага выкарыстання анатамічнай і клінічнай тэрміналогіі (вядзення зносін на беларускай мове ў прафесійнай сферы, выступлення з навуковымі паведамленнямі і публічнымі прамовамі). Для больш трывалага авалодання прафесійнай лексікай, а таксама агульнымі ведамі па спецыяльнасці ў дадатковай частцы дапаможніка змешчаны навукова-папулярныя і навукова-вучэбныя тэксты. Дапаможнік напісаны на высокім навукова-метадычным узроўні, у ім рэалізаваны ўсе неабходныя патрабаванні, якія прад’яўляюцца да лінгвістычных дапаможнікаў у вышэйшых навучальных установах Рэспублікі Беларусь.

У вучэбна-метадычным дапаможніку «Беларуская мова» для студэнтаў 1 курса лячэбнага і медыка-дыягнастычнага факультэтаў медыцынскіх ВНУ (аўтар Т.А. Карніеўская, ГомДМУ) разглядаюцца характэрныя рысы беларускага правапісу, у тым ліку запазычанай лексікі, асаблівасці паходжання і развіцця тэрмінаў, а таксама сістэмныя адносіны ў медыцынскай тэрміналогіі. Лексіка разглядаецца у сукупнасці са стылістыкай, што дае магчымасць студэнтам у будучым адбіраць моўныя сродкі адпаведна зместу, стылю, жанру выказвання [4].

Навучальны дапаможнік па беларускай мове для студэнтаў медыцынскіх ВНУ «Медыцынская тэрміналогія. Лексіка. Стылістыка» (аўтар В.У. Кліменка, ГомДМУ) прызначаны для студэнтаў медыцынскіх ВНУ і ўключае асноўную тэму, прысвечаную медыцынскай тэрміналогіі, а таксама тэмы, якія непасрэдна прымыкаюць да яе – лексіку і стылістыку. Пры навучанні лексіцы разглядаюцца як уласнабеларускія медыцынскія тэрміны, так і запазычаныя. Прапануюцца практыкаванні для развіцця вуснай і пісьмовай мовы: падабраць сінонімы (антонімы), растлумачыць паронімы, вызначыць амонімы і мнагазначныя словы, знайсці ў сказах моўныя хібы, выправіць памылкі і інш. Ажыццяўляецца прынцып міжпрадметных сувязей: паўтараецца і замацоўваецца матэрыял (грэка-лацінскія тэрмінаэлементы, пададзеныя з улікам беларускіх фанетычных асаблівасцей), які вывучаўся на занятках па лацінскай мове [5].

Вучэбна-метадычны дапаможнік «Беларуская мова: прафесійная лексіка» (аўтары: В.В. Невядомская, Г.В. Пржэвальская, ВДМУ) прызначаны для

падрыхтоўкі да заняткаў па дысцыпліне «Беларуская мова: прафесійная лексіка», будзе запатрабаваны ў студэнтаў 1 курса лячэбнага, стаматалагічнага і педыятрычнага факультэтаў. Складаецца з 5 (модуляў), у адным з якіх падрабязна даецца класіфікацыя лексічнай сістэмы беларускай мовы, аднак адсутнічаюць практыкаванні для замацавання тэарэтычнага матэрыялу [6].

Метадычны дапаможнік «Метадычныя ўказанні для студэнтаў па дысцыпліне «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» для 1 курса педыятрычнага факультэта (аўтары: В.В. Невядомская, Г.В. Пржэвальская, ВДМУ) змяшчае вучэбныя і выхаваўчыя мэты заняткаў, разлік вучэбнага часу, агульныя метадычныя ўказанні, а таксама патрабаванні да ходу заняткаў, метадычны апарат для арганізацыі самастойнай работы студэнтаў. Матэрыял дапаможніка падзелены на 17 заняткаў. Заняткі № 3, 4 адводзяцца вывучэнню лексічнай сістэмы беларускай мовы, тэрміналогіі, а таксама ўключаюць пытанні для самападрыхтоўкі па змесце заняткаў; пытанні для аўдыторнага кантролю ведаў; агульную класіфікацыю лексікі і беларускіх дыялектаў. Па вывучаным лексічным матэрыяле прапануюцца тэсты, якія можна выкарыстоўваць у якасці кантрольных [7].

Дапаможнік «Беларуская мова. Прафесійная лексіка для медыкаў» (аўтар В.І. Варанец, ГрДМУ) прызначаны для студэнтаў установ вышэйшай адукацыі па спецыяльнасцях профілю адукацыі «Ахова здароўя». Дапаможнік уключае звесткі пра мову, шляхі яе паходжання, развіцця і станаўлення. Вялікае месца адводзіцца пытанням беларускай медыцынскай тэрміналогіі. Падаюцца руска-беларускі і беларуска-рускі перакладныя слоўнікі, якія могуць быць выкарыстаны студэнтамі пры падрыхтоўцы да напісання пісьмовых работ [8].

Дапаможнік «Беларуская мова. Медыцынская лексіка» (аўтар В.І. Варанец, ГрДМУ) прызначаны для студэнтаў медыка-псіхалагічнага факультэта ў якасці асноўнай літаратуры. Складаецца з чатырох частак. Трэцяя частка змяшчае мастацкія і публіцыстычныя тэксты для вуснага пераказу, моўныя элементы прафесійнай дзейнасці ўрача і практычныя заданні, якія ставяць за мэту навучыць студэнта свабоднаму валоданню вуснай беларускай мовай у прафесійнай сферы. Змешчаныя ў чацвёртай частцы тэксты для пісьмовых перакладаў дазволяць студэнтам паспяхова засвоіць медыцынскую лексіку і карыстацца ёй на практыцы [9].

Вучэбна-метадычны дапаможнік «Беларуская мова : прафесійная лексіка» (для спецыяльнасцей медыка-біялагічнага профілю) (аўтары: Н.У. Чайка, А.А. Носік, Т.Н. Мельнікава) змяшчае вучэбныя заданні і адаптаваныя тэксты з перадтэкставымі і паслятэкставымі заданнямі, а таксама кантрольныя работы, якія дазволяць паглыбіць веды па беларускай мове і засвоіць лексічны матэрыял, неабходны для вядзення дакументацыі і вусных зносін у прафесійнай сферы [10].

Для эфектыўнага засваення медыкамі новай лексікі ў большасці вышэй пералічаных дапаможнікаў выкарыстоўваюцца спецыяльна падабраныя лексічныя практыкаванні: пераклад прафесійных тэкстаў, падбор слоў да прапанаваных дэфініцый, устаўка ў тэкст прапушчаных слоў, завяршэнне незакончаных сказаў і інш. Прапануюцца таксама прафесійныя тэксты, якія дапамагаюць не толькі знаходзіць тэрміны, але тлумачыць іх семантыку. Для

замацавання новага лексічнага матэрыялу прадугледжаны трэніровачныя тэсты, а пракантраляваць якасць засваення пройдзенага матэрыялу дазваляюць кантрольныя тэсты адкрытага і закрытага тыпаў.

Аўтары дапаможнікаў спалучаць пісьмовыя заданні з вуснымі (адказы на пастаўленыя пытанні, пераказ тэкставых урыўкаў і інш.), паколькі разам яны садзейнічаюць трэніроўцы доўгатэрміновай памяці.

Усе вышэйпералічаныя выданні падрыхтаваны на высокім прафесійным узроўні, складзены ў адпаведнасці з тыпавой вучэбнай праграмай курса «Беларуская мова: прафесійная лексіка», накіраваны на сістэматызацыю і паглыбленне ведаў студэнтаў па беларускай мове і могуць быць выкарыстаны як у якасці асноўнай, так і дадатковай літаратуры.

## Літаратура


1. Ярошевич, С. П. Анатомия: словарь / С. П. Ярошевич [и др.]. –Минск : Белорус. гос. мед. ун-т, 2016.– 248 с.
2. Кітаева, Т. В. Беларуская мова. Прафесійная лексіка: вучэб.-метад. дапам. / Т. В. Кітаева, Н. В. Ратынская. – Мінск: Беларус. дзярж. мед. ун-т, 2015. –130 с.
3. Носік, А. А. Беларуская мова: стаматалагічная тэрміналогія : вучэб.-метад. дапам. / А. А. Носік, Н. В. Ратынская, Н. У. Чайка. – Мінск : Беларус. дзярж. мед. ун-т, 2020. – 103 с.
4. Карніеўская, Т. А. Беларуская мова : вучэб.-метад. дапам. / Т. А. Карніеўская. – Гомель : Гомел. дзярж. мед. ун-т, 2014. – 56 с.
5. Кліменка, В. У. Медыцынская тэрміналогія. Лексіка. Стылістыка : вучэб. дап. па бел. мове для студэнтаў мед. ВНУ / В. У. Кліменка. – Гомель : Гомел. дзярж. мед. ун-т, 2004. – 39 с.
6. Невядомская, В. В. Беларуская мова: прафесійная лексіка : вучэб.-метад. дапам. / В. В. Невядомская, Г. В. Пржэвальская. – Віцебск : Віцеб. дзярж. мед. ун-т, 2023. – 283 с.
7. Невядомская, В. В. Метадычныя рэкамендацыі для студэнтаў па дысцыпліне «Беларуская мова: прафесійная лексіка» для спецыяльнасці 1-79 01 02 «Педыятрыя» для 1 курса педыятрычнага факультэта / В. В. Невядомская, Г. В. Пржэвальская. – Віцебск : Віцеб. дзярж. мед. ун-т, 2023. – 111 с.
8. Варанец, В. І. Беларуская мова. Прафесійная лексіка для медыкаў : вучэб. дапам. / В. І. Варанец. – Мінск : Рэсп. ін-т выш. шк., 2018. – 129 с.
9. Варанец, В. І. Беларуская мова. Медыцынская лексіка: дапаможнік / В. І. Варанец. – Гродна : Гродзен. дзярж. мед. ун-т, 2020. – 162 с.
10. Беларуская мова : прафесійная лексіка (для спецыяльнасцей медыка-біялагічнага профілю) : вучэб.-метад. дапам. / Чайка, Н. У. [і інш.]. – Мінск : Беларус. дзярж. мед. ун-т, 2020. – 103 с.